Создание межгосударственных медиаструктур в рамках ЕАЭС, безусловно, явится весомым фактором активизации интеграционных процессов. В то же время неизбежная в этом случае структурная трансформация национальных медийных систем не должна привести к нарушению принципов информационного суверенитета. Данное противоречие может быть снято при условии создания в системе органов управления евразийской интеграцией единого координационного центра, ответственного за эффективность медийного сотрудничества стран-партнеров.

*Библиографические ссылки*


1. Венидиктов, С. В. Медиакоммуникация в развитии евразийского пространства: стратегический ресурс интеграции : монография / С. В. Венидиктов. – Минск : БГУ, 2018. – 263 с.
2. Венидиктов, С. В. Медiакоммунiкацiйний простiр Евразiйского економiчного союзу: сферний пiдхiд до аналiзу iнтеграцiйного потенцiалу / С. В. Венидиктов // Наукова школа Романа Iванченка : матерiали V Мiжнародної наук.-практ. конференцiї. – Київ : КПI, 2017. – С. 19–25.
3. Договор о Евразийском экономическом союзе от 29.05.2014 в ред. от 08.05.2015 // «Консультант-плюс» : сайт компании [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.consultant.ru/document/cons_doc_LAW_163855/. – Дата доступа : 20.09.2018.
4. Якушенко, К. В. Концептуальные основы формирования единого информационного пространства в Евразийском экономическом союзе / К. В. Якушенко // Thesaurus : зб. навук. прац ; пад агул. рэд. С. В. Венідзіктава. – Вып. III. Інфармацыйна-прававое поле еўразійскай інтэграцыі. – Магілёў, 2016. – С. 71–81.


**Інга Воюш**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

# ПРАПЕДЭЎТЫКА АКАДЭМІЧНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ АДАПТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ-ЖУРНАЛІСТАЎ

У вышэйшыя навучальныя ўстановы 2018–2019 навучальнага года прыйшлі навучэнцы ўстаноў сярэдняй адукацыі 2000 года нараджэння. Ужо на падрыхтоўчых курсах яны праявілісябе як людзі, інтэлектуальна адораныя, арыентаваныя на актыўныя формы ўзаемадзеяння з рэальнасцю, на прагматыка-дзейсны падыход да свету, здольныя да псіхалагічнай гнуткасці, разнастайных паводзінавых патэрнаў, да першапачатковага мэтапакладання, тэхнічна пісьменныя, матываваныя

на поспех. Адзначаныя акалічнасці зноў робяць актуальнымі пытанні аптацыі студэнтаў да самастойнай, планамернай, фармалізаванай вучобы ва ўніверсітэце.

Псіхалагічныя, сацыялагічныя, педагагічныя даследаванні 2010-х гг. як айчынных вучоных [4; 13; 14], так і спецыялістаў блізкага замежжа [5; 9; 11; 12; 2; 6; 10] паказваюць, што больш за 50 % першакурснікаў маюць цяжкасці на пачатковым этапе адаптацыі. А. Куніцкая (БДПУ, 2015) вылучае чатыры аспекты адаптацыйнага працэсу – акадэмічны, сацыяльны, псіхафізіялагічны і бытавы. Сацыёлагі-практыкі сцвярджаюць: найбольш складаным для маладых людзей з'яўляецца менавіта акадэмічны аспект адаптацыі. Следам за Н. Фаміной заўважым, што студэнты творчых спецыяльнасцяў больш схільныя да глыбокага перажывання асобасных крызісаў, абвастрэння нервова-псіхічных захворванняў, менш падрыхтаваныя да пераадолення ціску асяроддзя, перажыванняняў і інш.

Звернемся да асаблівасцяў акадэмічнай адаптацыі студэнтаў факультэта журналістыкі БДУ. Даследаванні, праведзеныя ў БДУ (Шасцітка, 2011), даказваюць, што найбольш дэзадаптавальным становіцца для студэнтаў менавіта навучальны працэс. Адбываецца так званы «дыдактычны крызіс». Фарміраванне акадэмічных кампетэнцый заклікана змякчыць негатыўнае ўздзеянне дэзаптавальных фактараў. Пераадоленню «дыдактычнага крызісу» і, адпаведна, закладванню акадэмічных кампетэнцый спрыяюць разнастайныя формы працы з журналістамі-першакурснікамі.

*На ўзроўні ўніверсітэта* адаптацыйнымі працэсамі мэтанакіравана займаюцца ўпраўленне выхаваўчай работы і псіхалагічная служба. На сайце http://bsu.by/ створана асобная старонка «Гід першакурсніка БДУ». Пераважна там прадстаўлены структуры, адказныя за сацыяльна-бытавую адаптацыю. Акадэмічныя кампетэнцыі студэнтаў-пачаткоўцаў заклікaны фарміраваць раздзелы згаданай старонкі «Бібліятэка» і «Навуковая дзейнасць студэнтаў».

Стаў штогадовым агульнаўніверсітэцкі праект «Студэнт БДУ на тыдзень». Куратары-студэнты забяспечваюць пагружэнне абітурыентаў ва ўніверсітэцкі асяродак, суправаджаюць іх на занятках і пазавучэбных мерапрыемствах, знаёмяць са спецыфікай спецыяльнасцяў і напрамкаў падрыхтоўкі. Выпускнікі праекта ўвосень значна хутчэй уключаюцца ў студэнцкае жыццё, не адчуваюць боязі здацца безгрунтоўнымі ў вачах аднагодкаў, лёгка аперыруюць набытым вопытам.

Псіхалагічная служба БДУ распрацавала дапаможнік па адаптацыі першакурснікаў «Правілы паспяховага студэнта» [7], дзе прадстаўлены

матэрыялы па арганізацыі рэжыму вучэбнай дзейнасці і самастойнай работы, эрганоміцы інтэлектуальнай працы. Таксама карысным інструментам уключэння ў студэнцкае жыццё і яго суправаджэння стала кніга «Псіхалогія дзён» [8], дзе неафіты могуць запазычыць звесткі пра тайм-менеджмент, эканомію эмацыянальных, асобасных рэсурсаў, асновы планавання жыцця. Да ўсяго допісы для першакурснікаў з'яўляюцца ў самай папулярнай сярод тынэйджараў сетцы «Інстаграм».

*З боку факультэта* першапачатковую адаптацыю забяспечвае ПВС, заняты на падрыхтоўчых курсах па дысцыпліне «Творчасць». Задача курса – не толькі прафесійная арыентацыя і падрыхтоўка абітурыентаў да ўступных іспытаў, але і азнаямленне з асноўнымі акадэмічнымі кампетэнцыямі (вуснае выступленне, пісьмовае паведамленне, рэфераванне, канспектаванне, пошук і фільтрацыя інфармацыі, яе сістэматызацыя і крытычны аналіз), а таксама ўмовамі навучання: традыцыямі, структурай факультэта, асаблівасцямі лекцыйна-семінарскай арганізацыі працы і прамежкавага кантролю ведаў. Таксама з функцыянаваннем курсаў спалучана кансультацыйная дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў-куратараў у суполцы «Абітурыенты Інстытута журналістыкі БДУ» сацыяльнай сеткі «УКантакце».

Пачатковую адаптацыю таксама забяспечваюць такія мерапрыемствы, як сустрэчы дэкана і загадчыкаў кафедры з новымі студэнтамі, вераснёўскія прафесарскія лекцыі. Таксама з мэтай фарміравання адпаведных уменняў і навыкаў у навучальныя планы ўведзены факультатыўныя дысцыпліны «Універсітэтазнаўства», «Бібліятэказнаўства», на спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» і «Журналістыка (менеджмент СМІ)» – «Акадэмічнае пісьмо». На сёння змест курса ўніверсітэтазнаўства тычыцца гісторыі развіцця навучальных устаноў. Гэта павышае эрудыцыю першакурснікаў, але не вырашае задач фарміравання так званых «субнавыкаў» – «інфармаванасці, стратэгіі і практыкі» [3, с. 36]. У межах названага курса мэтазгодна даваць skills4study, як гэта прынята ў заходнееўрапейскіх універсітэтах [1; 3]. А менавіта дапоўніць змест матэрыялу тэмамі «Крытычнае мысленне ў навучальным працэсе»,«Самаарганізацыя вучэбнай дзейнасці», «Тайм-менеджмент», «Стварэнне і правядзенне прэзентацый», «Самастойнае мэтапакладанне ў прафесійнай сферы», «Пошук рашэння праблем», «Электронныя рэсурсы БДУ. Асабісты кабінет. Карта студэнта». Карыснымі былі б звесткі па асновах стэнаграфіі, эфектыўных спосабах канспектавання – напрыклад, па метадзе Гейтса, Корнэла, Б'юзана.

З боку дэканата праводзіцца інфармацыйная і дыспетчарская работа. У арганізацыйным кірунку дапамогу старастам-першакурснікам аказваюць таксама савет стараст і савет па якасці адукацыі. Дадаткова мерапрыемствы для студэнцкага актыву праводзяцца ў рамках вучэбна-адукацыйнага семінара «Ты староста» ў САК «Брыганціна».

На плечы ПВС прыпадае найбольшая нагрузка па ўвядзенні студэнтаў у вучэбную дзейнасць. У першую чаргу гэта куратарская праца ў акадэмічных групах: экскурсіі па вучэбным корпусе, знаёмства з віртуальным універсітэтам, навучанне карыстанню неабходнай дакументацыяй (раскладам, графікам навучальнага працэсу, рабочымі планамі, праграмамі). Пазней – складанне гайдаў «Пра семінары – на пальцах», «Як здаваць залікі і экзамены», «10 крокаў да напісання курсавой работы» для распаўсюджвання ў сацсетках (у нашым выпадку – «УКантакце»). Затым тлумачэнне адрозненняў паміж рознымі тыпамі аўдыторных і самастойных заняткаў (УСР, КСР) і ступенню / формамі ўдзелу ў іх студэнта, удакладненне крытэрыяў і форм прамежкавай і выніковай атэстацыі, допуску да экзаменацыйнай сесіі.

Лагічным працягам гэтай працы становяцца ўступныя лекцыі выкладчыкаў, на якіх ППС знаёміць студэнтаў з патрабаваннямі да засваення вучэбнага прадмета, дае парады па найбольш эфектыўным авалоданні ўменнямі і навыкамі, інструктуе аб працы з вучэбна-метадычнымі матэрыяламі, мастацкімі тэкстамі, першакрыніцамі.

Некалькі стыхійна работа па фарміраванні ў першакурснікаў арганізацыйна-акадэмічных кампетэнцый выбудоўваецца са студэнтамі-куратарамі. Гэта найбольш эфектыўная форма камунікацыі «роўны навучае роўнага». Студэнты атрымліваюць хуткую, эфектыўную, часта нават кругласутачную дапамогу. З іншага боку – ад старшакурснікаў перадаецца як пазітыўны, так і негатыўны «фальклор», часам спалучаны з запалохваннем малодшых таварышаў складанымі прадметамі, строгасцю выкладчыкаў, часам – з рэстрыкцыянізмам, перадачай «хаджалымі» вопыту ў духу «ўсё роўна не адлічаць». Паказальна, што на працягу апошніх гадоў куратарамі, за невялікім выключэннем, становяцца актывісты ўніверсітэцкіх арганізацый, для якіх вучэбная дзейнасць не з'яўляецца вядучай. Думаецца, выхад, па-першае, у крытэрыяльным адборы куратараў, па-другое, у акумуляцыі, генераванні і распаўсюджанні пазітыўных «легенд» факультэта.

Перспектыўным напрамкам адаптацыйнай працы з'яўляецца рэгулярнае абнаўленне сайта факультэта журналістыкі www.journ.bsu.by. Важным дадаткам да віртуальнага факультэта маглі б стаць агульнадаступныя афіцыйныя старонкі выпускаючых кафедраў у

сацыяльных сетках, якія забяспечылі б прамы кантакт акадэмічных груп першага курса з лабарантамі кафедр і зарэгістраванымі ў сетцы выкладчыкамі.

Такім чынам, якасць дыдактычнай адаптацыі напрамую звязана з фарміраваннем у студэнтаў-першакурснікаў першапачатковых акадэмічных кампетэнцый. У гэтым працэсе апасродкавана прымаюць удзел агульнаўніверсітэцкія структуры, але асноўная частка працы выконваецца прафесарска-выкладчыцкім складам, які ўлічвае ўнікальныя асаблівасці як студэнцкага кантынгенту, так і прафесійнай падрыхтоўкі журналістаў.

*Бібліяграфічныя спасылкі*


1. Дрю, С. Искусство быть студентом. Руководство по навыкам обучения / С. Дрю, Р. Бингхэм ; пер. с англ. Н. Друговейко. – М. : ГИППО, 2004. – 304 с.
2. Іванюк, І. Проблеми адаптації студентів / І. Іванюк // WEB-ресурс науково-практичних конференцій: Третя міжнародна науково-практична конференція «Наука в інформаційному просторі», 29–30 окт. 2007 р. / Луцький інститут розвитку людини [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://www.confcontact.com/2007nov/ivanyuk.php. – Дата доступу: 7.08.2018.
3. Коттрелл, С. Успешная учеба в вузе. Самые важные навыки студента / С. Коттрелл. – М. : ЭКСМО, 2015. – 368 с.
4. Куницкая, О. Стартовый потенциал студентов-первокурсников: факторы успешной адаптации / О. Куницкая // Народная асвета. – 2015. – № 12. – С. 8–11.
5. Огарева, Е. Адаптация студентов к условиям обучения в вузе в связи с их ценностными ориентациями : автореф. дис. … канд. психол. наук : 19.00.13 / Е. Огарева ; Северо-Западная академия государственной службы // Научная библиотека диссертаций и авторефератов disserCat. – СПб., 2010 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.dissercat.com/content/adaptatsiya-studentov-k-usloviyam-obucheniya-v-vuze-v-svyazi-s-ikh-tsennostnymi-orientatsiya#ixzz5P61AsHPp. – Дата доступа : 12.08.2018.
6. Першина, А. Адаптація студентів до навчання у вищих навчальних закладах / А. Першина // Освітарегіону: Політологія. Психологія. Комунікації. – 2011. – № 3 [Електронний ресурс]. – Режим доступу : http://social-science.com.ua/article/590. – Дата доступу : 07.08.2018.
7. Правила успешного студента / сост. : Р. П. Попок, О. В. Шапошникова ; под общ. ред. Р. П. Попка. – Минск : БГУ, 2009. – 62 с.
8. Психология дней : пособие для студентов БГУ / сост. : Т. А. Горбацевич, Р. П. Попок, Н. В. Токарева ; под общ. ред. Р. П. Попка. – Минск : БГУ, 2011. – 152 с.
9. Резник, С. Адаптация студентов-первокурсников к условиям обучения в университете: опыт, проблемы, перспективы / С. Резник, М. Черниковская, Е. Носова // Вестник Кемеровского государственного университета. Сер.: Гуманитарные и общественные науки. – 2017. – № 2. – С. 36–41.

10. Синиця, Я. Адаптація студентів-першокурсників до умов ВНЗ / Я. Синиця // Науковий огляд: збірники матеріалів наукових інтернет-конференцій. Соціум. Наука. Культура. Педагогіка [Електронний ресурс]. – Режим доступу : http://intkonf.org/sinitsya-yav-adaptatsiya-studentiv-pershokursnikiv-do-umov-vnz/. – Дата доступу : 07.08.2018.
11. Стенина, Т. Адаптация первокурсников в образовательной среде вуза как период эволюционных преобразований / Т. Стенина // Проблемы педагогики и психологии. – 2016. – № 1. – С. 243–253.
12. Фомина, Н. Сравнительный анализ особенностей социально-психологической адаптации студентов с различной структурной организацией общительности / Н. Фомина, И. Бакова // Известия Самарского научного центра Российской академии наук. – 2010. – Т. 12. – № 2 (3). – С. 447–450.
13. Хацкевич, Н. Адаптация студентов к учебной деятельности / Н. Хацкевич // Конференция МИДО / Белорус. нац. техн. ун-т. – Минск : БНТУ, 2014 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.bntu.by/news/67-conference-mido/1641-2014-11-24-09-42-26.html. – Дата доступа : 30.08.2018.
14. Шаститко, А. Факторы и условия адаптации студентов-первокурсников в вузе / А. Шаститко // Сборник работ 67-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, 17–20 мая 2010 г., Минск. В 3 ч.– Минск : БГУ, 2011. – Ч. 2. – С. 185–187.

**Пётр Дарашчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

# РЭДАКТАРЫ ГАЗЕТ І ЖУРНАЛІСТЫ ГУБЕРНСКІХ УСТАНОЎ У ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПРЭСЫ МІНШЧЫНЫ (1838–1917 гг.)

У Беларусі XIX ст. пачатак працэсу фарміравання рэгіянальнай прэсы, якой сёлета спаўняецца 180 гадоў, паклала стварэнне ў Вільні, Мінску, Віцебску, Гродне, Магілёве афіцыйных органаў мясцовых улад – «губернских ведомостей». Дзейнасць гэтых выданняў на працягу амаль васьмі дзесяцігоддзяў стала прыкметнай з’явай у гісторыі айчыннай журналістыкі. У гэты перыяд закладваўся падмурак не толькі газетнай справы, але і паліграфічных магутнасцей вялікага нацыянальнага рэгіёна. З работай мясцовых рускамоўных выданняў у беларускім краі была цесна звязана інфармацыйная палітыка шэрагу дзяржаўных губернскіх устаноў, што актыўна ўключалі ў свае штаты пасады журналістаў, якіх можна лічыць папярэднікамі сучасных прэс-службаў, або аддзелаў па сувязях з грамадскасцю.

Як адзначаў М. М. Улашчык на прыкладзе «Минских губернских ведомостей», нават неафіцыйная частка гэтага выдання на працягу